суправаджэнне вербальнай інфармацыі метадам дэманстрацыі; «белетрызаваны» аповед; абавязковае задзейнічанне вучняў у актыўным успрыманні лекцыі праз практычныя прыёмы работы.

**Літаратура**

1 Руцкая, А. В. Методыка выкладання беларускай літаратуры / А. В. Руцкая, М. У. Грынько. – Мінск : Изд-во Гревцова, 2010. – 184 с.

***М. У. Буракова***
*г. Гомель, УА «ГГТУ імя П. В. Сухога»*
***З. У. Шведава***
*г. Гомель, УА «ГДУ імя Ф. Скарыны»*

## ДЫСТАНЦЫЙНАЯ ФОРМА АТРЫМАННЯ АДУКАЦЫІ: БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)

Інтэнсіўнае развіццё новых камп'ютарных і інтэрнэт-тэхналогій спрыяе развіццю новых спосабаў навучання. Адным з такіх з'яўляецца дыстанцыйнае навучанне з дапамогай інтэрнэт-тэхналогій. Сёння тэхналогія дыстанцыйнага навучання – эфектыўная і перспектыўная сістэма падрыхтоўкі сучасных высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Укараненне сістэмы дыстанцыйнага навучання на тэрыторыі Беларусі з'яўляецца актуальным напрамкам у развіцці вышэйшай адукацыі. Даная сістэма навучання дазваляе павысіць эфектыўнасць і даступнасць адукацыі за кошт актыўнага выкарыстання навуковых і педагагічных магчымасцей вышэйшай школы, а таксама забяспечыць адукацыйнымі паслугамі патэнцыяльных спажыўцоў. Дыстанцыйнае навучанне з'яўляецца формай атрымання адукацыі, пры якой у адукацыйным працэсе выкарыстоўваюцца традыцыйныя і спецыфічныя метады, сродкі і формы навучання, заснаваныя на камп'ютарных і тэлекамунікацыйных тэхналогіях. Аснову адукацыйнага працэсу пры дыстанцыйным навучанні складае мэтанакіраваная і кантралюемая інтэнсіўная самастойная работа навучэнца, які можа вучыцца ў зручным для сябе месцы, па індывідуальным раскладзе. Навучэнец павінен быць забяспечаны камплектам спецыяльных сродкаў навучання і магчымасцю кантактаў з выкладчыкам і іншымі навучэнцамі па тэлефоне, факсе, электроннай і звычайнай пошце, а таксама вочна.

З 2015 г. на завочным факультэце УА «ГДТУ імя П. В. Сухога» пачалася падрыхтоўка студэнтаў па спецыяльнасці «Маркетынг» у дыстанцыйнай форме навучання. Перад увядзеннем гэтай формы

навучання на завочным факультэце, адміністрацыяй універсітэта была праведзена інтэнсіўная падрыхтоўчая работа:

– выкладчыкі прайшлі навучальныя курсы «Падрыхтоўка дыстанцыйных электронных вучэбных курсаў у LMSMoodle»;

– распрацаваны вучэбны план навучання студэнтаў па спецыяльнасці «Маркетынг» у дыстанцыйнай форме;

– распрацаваны нормы часу для разліку вучэбнай нагрузкі выкладчыкаў пры правядзенні заняткаў у дыстанцыйнай форме і інш.

Дысцыпліна «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» увайшла ў агульную колькасць дысцыплін, якія вывучаюцца студэнтамі спецыяльнасці «Маркетынг» у дыстанцыйнай форме на 1 курсе і разлічана на 6 гадзін, з якіх 2 – у рэжыме on-line і 4 – у рэжыме off-line. Кансультацыі студэнты дыстанцыйнай формы адукацыі могуць атрымліваць у рэжыме on-line, расклад якіх размешчаны выкладчыкам на форуме навін. Для студэнтаў прадугледжаны таксама і аўдыторныя гадзіны: вучэбныя заняткі ў межах установачнай сесіі, дзе іх знаёмяць з адметнасцямі вывучэння дысцыпліны на вучэбным партале; дыягностыка сацыяльна-асобасных кампетэнцый студэнта на выніковым этапе (залік).

Трэба адзначыць, што выкладчык у дыстанцыйнай форме працы павінен:

– распрацаваць праграмна-метадычнае забеспячэнне;

– дапамагчы студэнтам дыдактычна правільна арганізаваць працэс навучэння;

– сфарміраваць матывацыю на авалодванне ведамі.

У аснову структуравання зместу вучэбнага матэрыялу па дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» пакладзены прынцып модульнага падыходу, які прадугледжвае падзел вучэбнага матэрыялу на тэматычны і кантрольны (рубежны і выніковы) модулі. Па кожнаму вучэбнаму модулю, у адпаведнасці з яго мэтамі і задачамі, праектуюцца і рэалізуюцца педагагічныя тэхналогіі: вучэбна-метадычныя комплексы, модульна-рэйтынгавая і варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы студэнтаў. Па прычыне таго, што дыстанцыйная форма навучання пераважна базіруецца на самастойнай рабоце студэнтаў, вельмі важна забяспечыць яе правільнае функцыянаванне. Асноўнымі інструментамі для гэтага служаць электронныя дапаможнікі і аўтаматызаваныя навучальныя сістэмы ў выглядзе электронных курсаў.

Наяўнасць электроннага курса па дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» з’яўляецца неабходнай умовай дыстанцыйнага навучання. Электронны курс мае адпаведную модульную структуру і наступны змест:

– агульныя матэрыялы па дысцыпліне (вучэбная праграма, кіраўніцтва па вывучэнню курса);

– форумы (форум навін, форум для кансультацыйнай падтрымкі самастойнай работы студэнтаў);

– віртуальная вучэбная аўдыторыя (рэсурсы для правядзення і запісу відэаканферэнцый);

– вучэбны матэрыял для самастойнай падрыхтоўкі і самакантролю ведаў (тэматычная прэзентацыя; тэматычныя відэаматэрыялы; практычны мінімум; рубежныя інтэрактыўныя тэсты);

– выніковы кантроль ведаў (заліковыя пытанні; выніковы інтэрактыўны тэст).

Выкарыстанне мультымедыйных інтэрактыўных сродкаў навучання ў дыстанцыйнай форме актывізуе ўсе віды дзейнасці студэнтаў і паскарае працэс засваення матэрыялу, а таксама павышае яго эфектыўнасць. Інтэрактыўнасць дазваляе падтрымліваць здольнасць да саманавучання.

У сувязі са з'яўленнем метадаў, пабудаваных на сучасных інфармацыйных тэхналогіях, у сферы адукацыі адбываюцца змены ў выкладчыцкай дзейнасці. Адбываецца пераразмеркаванне асноўных функцый выкладчыка. На першую пазіцыю выступае арганізатарская функцыя (арганізуе вучэбную дзейнасць); на другую – інфармацыйная (адказнасць за засваенне студэнтамі тэарэтычнага зместу, прадстаўленага ў электронных курсах) і на трэцюю – камунікатыўная (забяспечваць адпаведныя зносіны студэнтаў).

Выкладчык становіцца адначасова і арганізатарам і кансультантам у сістэме дыстанцыйнага навучання, які ажыццяўляе метадычную і арганізацыйна-кансультатыўную дапамогу студэнтам.

Такім чынам, граматная арганізацыя навучальнага працэсу ў дыстанцыйнай форме можа паслужыць гарантам атрымання якаснай беларускай адукацыі, якая будзе адпавядаць патрабаванням сучаснага грамадства сёння і ў перспектыве.

***О. И. Бушуева***
*г. Гомель, ГУО «Гимназия № 10»*

## СОЗДАНИЕ ИНФОРМАЦИОННО-ОБРАЗОВАТЕЛЬНОГО РЕСУРСНОГО ЦЕНТРА В УЧРЕЖДЕНИИ ОБРАЗОВАНИЯ

Одним из эффективных способов решения проблем доступности и качества образования является организация предпрофильной подготовки и профильного обучения. Данные формы обучения являются